

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №4 (20)
Снежань 2021

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **З надыходзячым Новым годам і Калядамі!!!** | **Стар. 1** |
| **Інфармацыйна-тлумачальная работа з вучнямі** | **Стар. 2** |
| **Інфармацыя для бацькоў** | **Стар. 2** |
| **Паседжанне сямейнага клуба “Вясёлка”** | **Стар. 3** |
| **Падпісная кампанія-2022** | **Стар. 4** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 4** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 5** |
| **Навагоднія ранішнікі** | **Стар. 6** |

## З надыходзячым Новым годам і Калядамі!!!




**Паважаныя настаўнікі,
вучні і бацькі!**

Прыміце шчырыя віншаванні з наступаючым Новым годам і Калядамі! Жадаем Вам ажыццяўлення запаветных мараў, міру, згоды, дабра, шчасця і ўдачы! Новых здзяйсненняў, новых поспехаў, рэалізацыі новых ідэй! Хай усё, што намечана, абавязкова здзейсніцца ў надыходзячым годзе, а блізкія, родныя і сябры заўсёды будуць для Вас падтрымкай!

З павагай і найлепшымі пажаданнямі,
**Рэдкалегія**

# Інфармацыйна-тлумачальная работа з вучнямі



У рамках правядзення інфармацыйна-тлумачальнай работы сярод дзяцей 10 снежня на агульнашкольнай лінейцы вучням даведзена інфармацыя аб дарожна-транспартных здарэннях з удзелам непаўналетніх, якія адбыліся ў бягучым годзе на тэрыторыі Мінскай вобласці. Праведзена прафілактычная гутарка аб выкананні правілаў дарожнага руху, пра бяспечныя паводзіны паблізу ад вадаёмаў.







# Інфармацыя для бацькоў




Што трэба ведаць бацькам, каб засцерагчы дзяцей ад злачынных прапаноў паспрабаваць наркотык ці стаць закладчыкам?

⚡ Асноўны спосаб вярбоўкі - рэклама ў Інтэрнэце. Могуць паабяцаць гандаль легальнымі стымулятарамі, а насамрэч даручаць распаўсюджваць псіхатропы - гэта крымінальна караецца❗👮

👉✨Павінна выклікаць трывогу: ✨
⚡⚡наяўнасць у тэлефоне фатаграфій мясцовасці;
⚡⚡выкарыстанне электронных кашалькоў;
⚡⚡выкарыстанне карт іншых уладальнікаў.

Паважаныя бацькі!!!🙏 Звярніце ўвагу на сваіх дзяцей 👦👧, што яны робяць у Інтэрнэце.

💥🔥У наркотыкаў заўсёды ёсць час для Вашых дзяцей, а ў Вас❓

# Паседжанне сямейнага клуба “Вясёлка”




18 снежня адбылося чарговае паседжанне сямейнага клуба "Вясёлка". Падчас мерапрыемства бацькі з дзецьмі абмяркоўвалі сямейныя традыцыі святкавання Новага года і Калядаў, дзяліліся рэцэптамі прыгатавання святочных страў, праводзілі майстар-класы па вырабу навагодніх упрыгожванняў.

Напярэдадні зімовых канікул бацькам была даведзена інфармацыя аб дарожна-транспартных здарэннях за 11 месяцаў бягучага года, якія адбыліся на тэрыторыі Мінскай вобласці, з удзелам непаўналетніх. Праведзена гутарка аб неабходнасці навучання выкананню правіл бяспечных паводзін дзяцей і ўручаны адпаведныя памяткі.





Мерапрыемства праходзіла ў цёплай, дружалюбнай атмасферы. Удзельнікі абмяняліся памятнымі падарункамі, зробленымі сваімі рукамі. Па традыцыі мерапрыемства скончылася чаяваннем з хатняй выпечкай.










Дарослыя і дзеці засталіся задаволены і з нецярпеннем чакаюць новых сустрэч.

# Падпісная кампанія - 2022




Педагагічны калектыў школы прыняў актыўны ўдзел у падпісной кампаніі на першае паўгоддзе 2022 года.

Лідэрамі сярод перыядычных выданняў, якія выпісваюцца, сталі газеты "Мінская праўда". "Узвышша", "Настаўніцкая", "СБ. Беларусь сегодня", часопісы "Адукацыя Міншчыны", "Юный спасатель", прадметныя часопісы "Замежныя мовы", "Пачатковая школа" і інш.







# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

23 снежня адбыўся занятак у Школе Актыўнага Грамадзяніна для вучняў 8-9 класаў па тэме "Гонар за Беларусь. Хутчэй. Вышэй. Мацней". Найбольшую цікавасць у вучняў выклікалі вынікі Алімпійскіх гульняў і поспехі на іх беларусаў. Таксама ў працэсе абмеркавання гэтай тэмы яны ўзгадалі свае экскурсійныя паездкі па памятных мясцінах Беларусі і намецілі маршрут наступнай такой паездкі.





# Шосты школьны дзень




Шосты школьны дзень **11 снежня** быў аб'яўлены Днём здароўя. У гэты дзень у школьнай бібліятэцы прайшла гульня-віктарына "Па прыступках здароўя". Дадзенае мерапрыемства праводзілася з мэтай фармавання ў вучняў адказных і беражлівых адносін да свайго здароўя.

Падчас мерапрыемства вучні даведаліся цікавыя факты аб здаровым ладзе жыцця, адгадвалі загадкі і адказвалі на пытанні віктарыны.

У мэтах прапаганды здаровага ладу жыцця, фарміравання ў вучняў адказнага стаўлення да свайго здароўя ў школьнай бібліятэцы прайшла тэматычная выстаўка "Мы за здаровы лад жыцця", на якой дзеці маглі азнаёміцца з кнігамі і брашурамі, прысвечанымі здароўю.






У суботу **18 снежня** ў школьнай бібліятэцы прайшла пазнавальная гульня-віктарына "Традыцыі Новага года і Калядаў". Падчас мерапрыемства вучні даведаліся пра гісторыю з'яўлення свят, удзельнічалі ў віктарыне, адгадвалі навагоднія загадкі і разгадвалі крыжаванкі. Пасля заканчэння мерапрыемства кожны ўдзельнік атрымаў прыз.





# Навагоднія ранішнікі



28 снежня ў школе прайшлі навагоднія ранішнікі "У гасцях у елачкі" для выхаванцаў дзіцячага сада і "Навагодняя казка" для вучняў 1-9 класаў.

Дзеці прымалі актыўны ўдзел у навагодніх конкурсах, вадзілі вясёлыя карагоды, гучна клікалі Дзеда Мароза і Снягурку, запальвалі агеньчыкі на елачцы, расказвалі вершы Дзеду Марозу і, вядома ж, з нецярпеннем чакалі падарункаў.

Былі падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшае навагодняе афармленне вучэбных кабінетаў:

1 месца - 1 клас
2 месца - 8 і 9 класы
3 месца - 2 клас
Віншуем пераможцаў!!!












Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 студзеня.